Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Наша Праўда

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 11 — Вільня, Серада 11-га траўня 1927 г. — Год I

Агідная праца.

Цэлы рад жорсткіх рэпрэсіяў, якія беларускі працоўны народ перанёс за апошнія часы, не дапяў сваей мэты: разьбіў жыцьцё і шчасьце адзінак, але не здалеў зламаць вечна жывога і нязломнага творчага духа народу. І вось у нейкіх цёмных, затхлых закамарках, скуль веець плесьняй і трупным смуродам, прадажныя слугі варожае нам сілы ўжо пачалі апрацоўваць новыя пляны барацьбы з магутным імкненьнем беларускіх сялян і работнікаў да адраджэньня і волі.

Трэба забіць творчы дух, трэба зламаць веру ў масах у творчыя сілы беларускага народу, трэба зьвясьці на нішто ўсе створаныя народам цэннасьці і—пераканаць масы, што іх будучына—толькі ў карыстаньні запазычанымі цэннасьцямі *чужое культуры*. Такія пляны праводзе польская часопісь у беларускай мове „Беларускі Дзень“.

Работа гэта—агідная,—куды горшая, чым палітычная правакацыя, чым торг жывымі людзьмі... Мэта гэтае работы—абярнуць беларускі народ у паўжывога трупа.

„Мы маем пракокаў нашага адраджэньня, маем сваіх Янку Купалу, Якуба Коласа, але ня маем яшчэ сваіх Міцкевічаў, свайго Шэўчэнкі. Мы маем першыя расткі нашае школы, але ня маем свае навукі і сваіх вучоных. Мы маем сваіх земляробаў, але ня маем кадру сваіх аграномаў і г. д. І якую-б галіну нашага жыцьця мы ні ўзялі, дык усюды бачым нашую нясьпеласьць, нашую слабасьць і ня можам заімпонаваць нашым суседзям і змусіць іх лічыцца з намі, як з народам вольным душою, з народам, якога нельга абмінаць на ніве палітычнага, эканамічнага, культурнага і наогул грамадзкага жыцьця“...

Так піша „Беларускі Дзень“. Так пішуць людзі, якія дужа добра ведаюць, што якраз ня толькі славянскія народы, як вялікарусы, украінцы, чэхі і інш., але і неславянскія — бачаць на нашым Парнасе і Міцкевічаў, і Шэвчэнкаў,*) бачаць вялізарную творчую культурную працу беларускага народу і ў паэзіі, і ў навуцы. Увесь культуры сьвет бачыць, як за гранічнай мяжой, што разрэзала цела жывога беларускага народу, працуюць тысячы беларускіх школаў, у тым ліку — чатыры вышэйшыя, як выступае на арэну доўгі сьцяг беларускіх вучоных, як закладаюцца беларуская акадэмія навук, музэі і вялізарныя архівы нашае слаўнае даўніны,—бачыць, як рукамі народу творыцца новы гаспадарчы лад,—бачыць усё гэта і вітае магутны творчы парыў беларускіх масаў да волі і культурнага жыцьця і—прарочыць нам сьветлую будучыню. І першы раз нягодная ілжа, быццам мы нічога ня маем, нічога ня творым і да нічога ня здольныя, надрукована ня Обстам, ня ў польскай мове, а ў беларускай!

Мы ня можам паверыць, каб нешта падобнае выйшла спад пяра беларуса. Мы глыбока пераканаНы, што стацьця „Бел. Дня“ была напісана ў другой мове і толькі пасьля перакладзена на беларускую. Дый аб гэтым сьведчыць і другая ілжа — ілжа аб тым, быццам перад беларусамі „гасьцінна расчынены“ дзьверы польскіх унівэрсытэтаў, толькі вось нейкія „палітыканы“ намаўляюць нашу моладзь да байкоту іх! І гэта пішацца пасьля таго, як ужо шэсьць гадоў беларускае грамадзянства дарэмна дабіваецца адчыненьня наглуха зачыненых дзьвераў польскіх унівэрсытэтаў для нашых матурыстаў, як апошнія з году ў год прымушаны патайна перабірацца заграніцу, каб там прадоўжыць недаступную тут вышэйшую адукацыю!

Характэрна, што, адначасна з тым, як кіраўнікі „Беларускага Дня“ хочуць выклікаць у нашых масах *зьняверые ў творчыя сілы нашага народу*,—адначасна група паслоў-беларусаў (іх на волі і ў добрым здароўі чатыры: Ярэміч, Рагуля, кс. Станкевіч і Аўсянік, дык знача нехта з іх!) стараецца забіць веру беларускіх масаў і ў іх *палітычныя сілы*. Уся польская прэса з дзікай радасьцяй апавядае аб тым, што гэная група паслоў зьвярнулася да прадстаўніка жыдоўскае буржуазіі пасла д-ра Выгодзкага, якому заявіла, быццам беларусы ў Вільні—гэта нуль і на выбарах у мястовую раду, пэўне-ж, ня здолеюць правясьці ніводнага свайго раднага; дык вось хай жыдоўская буржуазія „падаруе“ хоць адно мейсца ў радзе прадстаўніку беларускае буржуазнае ідэалёгіі, зьмясьціўшы яго сярод кандыдатаў у радныя на жыдоўскім сьпіску...

Хіба кожнаму ясна, якая цана гэтаму выступленьню з палітычнага пункту гледжаньня. Ня маючы ніякае надзеі на тое, каб беларускія работнікі і працоўная інтэлігенцыя ў Вільні падалі свой голас за паноў Ярэміча, ці кс. Станкевіча, гэтыя паны проста на ўвесь сьвет ілгуць, быццам у Вільні беларусаў усё роўна, як і няма... Ці-ж ня тое пішуць Обсты і Цаты? І ці не аднаму з гэтых „багоў“ хоча выслужыцца „група паслоў“, спрытна схаваўшая свае імёны?!

Лякайства—гэта духовая рыса *слабых*. І ўсе тыя, што ўсемі спосабамі выслугуюцца ці то польскай, ці літоўскай, ці жыдоўскай буржуазіі, усе тыя, што хочуць пераканаць беларускія масы ў слабасьці і нікчэмнасьці беларускага народу,—усе яны даюць толькі *доказ сваей уласнай слабасьці і нікчэмнасьці*...

Беларускія працоўныя масы, беларускія сяляне і работнікі, беларуская працоўная інтэлігенцыя — вераць у свае творчыя сілы, на іх спадзяюцца і ў службу да нікога ня пойдуць. А тым, што хацелі-бы забіць творчы дух беларускі, што стараюцца пазбавіць народ наш веры ў сваю творчую моц,—народ беларускі адкажа глыбокай *пагардай*.

*) Найвялікшыя расейскія поэты — Валеры Брюсов і К. Бальмонт—захопліваліся творчасьцяй Янкі Купалы і перакладалі яго творы на расейскую мову.

Як выглядае чэска-польскае зьбліжэньне.

У мінулым годзе пачалося так званае чэска-славацкае зьбліжэньне. Але з самага яго пачатку відаць было, што гэта толькі на вонак, як адна, так і другая старана праяўляюць сваю волю і жаданьне да гэтага зьбліжэньня, а ўнутры засталося тое самае недаверые і нясмак адзін да другога, які быў і перад „зьбліжэньнем“. Паміма афіцыяльнай прыязьні, якая праяўляецца ў „Чэска-польскіх“ і „польска-чэскіх“ клюбах у Празе і ў Варшаве і ў экскурсіях Чэхаў у Польшчу, а Палякоў у Чэхію, газэты польскія здраджаюць раз-па-раз свае сапраўдныя адносіны, асабліва ад нядаўных часоў, калі ў чэскай і польскай палітыцы пачаліся разбежнасьці. Гэтыя „шчырыя“ словы да чэхаў мы чытаем і ў віленскай прэсе. Так нядаўна была вельмі вострая ў адносінах да Чэхаў, зацемка ў „Ekspresie Wileńskim“ пад загалоўкам „Чэскі Бісмарчэк“, нападаючая на чэскага міністра замежных спраў д-ра Бэнэша. Калі можа сабе дазволіць на штосьць падобнае такая брукавая газэта як „Ekspres Wil.“, ня маючая а ні твару а ні напрамку—дык яшчэ нічога дзіўнага, бо можна думаць, што „Ekspres Wil.“ ня выказвае польскай грамадзкай думкі. Але, калі абшарніцкае „Słowo“ пускае шпількі ў чэскі бок, гэта ўжо штосьць азначае, бо „Słowo“ выяўляе пэўны кірунак польскай грамадзкай думкі і якраз думкі тэй часткі польскага грамадзянства, якое зьяўляецца асновай польскасьці ў нашых землях — абшарнікаў.

А між іншым „Słowo“ ў № 101 з дня 5 га мая г. г., абгаварываючы 50-я ўгодкі асвабаджэньня паўднёвых славян, кажа вось што:

„З прычыны гэтых угодкаў чэхі зрабілі прыгожную ўрачыстасьць. Чэскі мін.стар асьветы Горліцэ, старшыня сэнату Грубан, прадстаўнік прэзыдэнта Масарыка, а перадусім сам Крамаж (усе гэтыя паны зьяўляюцца дактарамі бязумоўна), сказалі надта харошыя прамовы, поўныя ўдзячнасьці Расіі, „якой няма і замест якой сусьветныя бадзякі“. Чэскія расейскія эмігранты з сьлязамі на вачох сэрдэчна дзякавалі за гэта. Зразумела, што ніхто не гаварыў аб тэй чыннай удзячнасьці і тэй чыннай помачы, якую аказалі нацыянальнай Расеі Чэска Славацкія легіёны, што ўкралі расейскае золата і выдалі адмірала Калчака бальшавіком“.

А ў другім месцы тэй самай газэты чытаем аб экскурсіях польскіх журналістаў у Прагу чэскую і чэскіх журналістаў у Польшчу ў знак прыязьні між Чэхаславацыяй і Польшчай.

Дык вось як выглядае польска-чэскае зьбліжэньне.

Чэх.

Міжнародавая Гаспадарчая Канфэрэнцыя

Як ужо ўсім ведама, у выніку сусьветнае вайны дзяржавы-пераможцы аказаліся пабітымі мо' значна больш небясьпечна, чым пераможаныя: яны аказаліся эруйнаванымі эканамічна. Найцікаўней, што ўсе палітычныя тэрытарыяльныя зыскі ня толькі не ўратавалі пераможцаў ад пагрозы банкруцтва, але ў значнай меры вэрсальская прагавітасьць пераможцаў на чужое дабро цяпер і губіць іх дзяржаўны дабрабыт. Бо перавага ваенна-палітычнага мамэнту над гаспадарчым, якая запанавала ў „новай Эўропе“ ў выніку „дрэннага міру“, усьцяж руйнуе гаспадарча яе краіны. Найбольш яркім прыкладам гэтага ваенна-палітычнага банкруцтва пераможца зьяўляецца Францыя. Яшчэ нядаўна азброеная да зубоў Францыя паноў Фоша і Пуанкарэ трымала пад жалезным ботам пабітую ды разброеную Нямеччыну, праз 3 — 4 гады толькі палітычнае ды гаспадарчае паразуменьне з Нямеччынай ўратавала Францыю ад фінансавай катастрофы, а мо' й ад дзяржаўнай руіны.

Пасьля вайны ўся Эўропа аказалася пад цяжкой рукой амэрыканскага азброенага ліхвяра, які ў часе вайны, праўда, „ўратаваў“ Эўропу ад нямецкай ваеннай дыктатуры, але за тое высмактаў з яе амаль ня ўсю яе „залатую кроў“,—ды цяпер завёў ў Эўропе фінансавую дыктатуру — ня горшую за якую іншую.

Але справа — ня толькі ў фінансавай залежнасьці Эўропы ад Амэрыкі.

Справа ў тым, што Эўропа ўжо ніколі ня вернецца да таго жыцьця, да тае сілы ў сусьвеце, якую мела да вайны. Ня толькі Амэрыка, але цэлы рад іншых краін, якія да вайны зьяўляліся толькі рынкамі збыту для эўрапэйскай прадукцыі, у часе вайны так шырока разьвілі сваю ўласную прамысловасьць, што цяпер абыходзяцца ўласнымі таварамі, ды навет яшчэ і канкуруюць з Эўропай—у самай Эўропе! Эўропа ніколі ня верне сабе поўнасьцяй гэтых старых сваіх рынкаў, як ніколі ня зробіцца, як да вайны, эканамічным дыктатарам вялізарных аграрных тэрыторыяў, што вытваралі выключна для яе сыр'ё. Навет найбагацейшая Англія, як ведама, перажывае, калі не катастрофу, дык страшэнны крызіс, з якога ніяк ня можа выбрацца. І вось, сярод буйна-прамысловых кругоў найбольш прамысловых дзяржаваў Эўропы спарадзілася думка, што трэба за ўсялякую цану неяк ратаваць палажэньне, пакуль ня позна. На нашых вачох наймагутнейшыя імпэрыялістычныя дзяржавы Эўропы, як Англія, Францыя, апынуліся пад пагрозай страціць свае „каляровыя валадзеньні“—калёніі. І гэтая пагроза, ведама-ж, ня менш, чым іншыя факты ўнутранага банкруцтва, змусілі пераможцаў да паразуменьня з пераможанымі, каб супольнымі сіламі ратаваць Эўропу ад гаспадарчай, а за тым і палітычнай катастрофы. „Аб'яднаньне Эўропы“ сталася лёзунгам, які пад розным відам пачаў пашырацца ўсюды.

Але „Панэўропа“, ці „Эўрапэйскія Злучаныя Штаты“, — гэта ўсё далёкія ідэалы, „музыка будучыны“. Ліга народаў, якая мела зьдзейсьніць палітычнае аб'яднаньне дзяржаў, хутка збанкрутавала, паміж іншым, дзеля таго, што прыняла за падставу якраз той самы штучны палітычны лад, які створаны быў ваеннай сілай пераможцаў. Ясна было, што без вайны гэты стан і лад зьмяніць чыста палітычнай дыскусіяй у Лізе — немагчыма... І вось, пасьля поўнага банкруцтва і кампрамітацыі эўрапэйскіх палітыкаў і дыпляматаў, што парэзалі Эўропу на кавалкі, злучаць ды ратаваць старую Эўропу ад катастрофы цяпер бяруцца эканамісты, банкіры і прамыслоўцы.

З пачыну трох буйных прамыслоўцаў: француза Люшэра, немца Рэхбэрга і бэльгійца Тэніса — і склікана гэтая Канфэрэнцыя, якая высоўвае плян „гаспадарчага аб'яднаньня Эўропы“. Праўда, значна раней за ўсіх аб аб'яднаньні ня толькі Эўропы, але і ўсяго сьвету, аб аб'яднаньні ўсіх працоўных гаварылі сацыялісты і камуністы; але як першыя, так і другія ня маюць ніякай улады ў значнай большасьці краёў, дзе цалком пануе буржуазія.

Галоўнай мэтай, якую стаўляе сабе Канфэрэнцыя, як экспазытура буйнай прамысловасьці галоўных прамсловых дзяржаваў Эўропы, зьяўляецца здабыцьцё і забясьпечаньне больш шырокіх ды паемных рынкаў для сваіх тавараў у Эўропе, бо заморскія рынкі — прапалі.

Імкненьне да пашырэньня рынкаў збыту ў самай Эўропе павінна змушаць да падняцьця дабрабыту шырокіх масаў спажыўцоў, без чаго рынак ня будзе мець, як кажуць „пакупнае сілы“. Тое ж імкненьне павінна змушаць прамыслоўца да больш разумнай, як кажуць: рацыянальнай,— арганізацыі вытворчасьці, што значна панізіла-бы кошты гэтай вытворчасьці, дык значыць і цэны тавараў. Аб'яднаньне прамыслоўцаў у вялізарныя суполкі (трэсты, сындыкаты, картэлі), забіваючы канкурэнцыю слабых прамыслоўцаў, шмат спрыяла бы гэтаму, бо-ж ведама, што вялікшы капітал можа вытвараць тавары значна таньней, чым малы. Навет, пры пэўных варунках, гэтыя вялізарныя вытворчыя аб'яднаньні былі-бы заінтэрасаваны ў тым, каб падняць плату работнікам ды гэтак павялічыць пакупную сілу вялізарнай арміі працоўных і стварыць з яе забясьпечаны заўсёды ўнутраны рынак для збыту тавараў. Гэтым шляхам — шляхам паднясьцьця заработнай платы ў гэткіх мэтах — часткова і йшла амэрыканская прамысловасьць, якая здабыла сабе такую сілу.

Усё гэта ясна само сабой, дый было прадбачана Марксам, як неабходны пераходны мамэнт у імкненьні сацыяльна-гаспадарчага жыцьця да сацыялізму. Але эўропэйская буржуазія галоўных прамысловых краёў перадусім — вялікіх дзяржаваў маніцца ратаваць сябе ня толькі гэтым шляхам, сколькі коштам слабейшых прамысловых дзяржаваў, якія імкнецца ператвараць у свае „калёніі“ ці паўкалёніі. Вялікія імпэрыялістычныя дзяржавы Эўропы, карыстаючыся сваёй аружнай сілай, маняцца забіваць прамысловую вытворчасьць слабейшых эўрапэйскіх дзяржаваў, прымушаючы іх стацца рынкамі збыту для сваіх тавараў ды ў пастаўшчыкоў сыр'я, што раней выпаўнялі заморскія калёніі.

Гэткім чынам, „гаспадарчае аб'яднаньне Эўропы“, праектаванае ідэалёгамі буржуазіі, абернецца перадусім у гаспадарчае падчыненьне ўсіх палітычна і прамыслова слабейшых дзяржаваў двум-тром эканамічным дыктатарам Эўропы, якія, зразумела, будуць — шляхам эканамічнае дыктатуры — змушаць іншыя дзяржавы выпаўняць і іх палітычную волю...

Калі ў першыя часы пасьля Вэрсалю ў Эўропе палітыка камандавала эканомікай, дык цяпер, як бачым, над палітыкай мае панаваць ужо эканоміка, дый панаваць так, што можа для палітыкі вялікіх дзяржаваў даць значна больш карысьці, чым зрабіла для іх сама палітыка...

Апанаваньне крызісу збыту для Эўропы, якая шмат больш вытварае, чым спажывае, як бачым, зьяўляецца першым крокам. Дык трэба перадусім зламаць тыя „платы“ ды

бар'еры, якія стаяць на шляхох таварнага руху — па ўсей Эўропе. Але якраз „новая Эўропа“, дзе напладзілася шмат новых дзяржаваў ды дзяржавак, набудавала вялізарную масу гэтых бар'ераў, каб бараніць сваю ўнутраную прамысловасьць ад заграничнай канкурэнцыі. Ясна, што якраз адчыненьне гэтых унутраных рынкаў малых дзяржаў для канкурэнцыі з боку магутнай аб'яднанай прамысловасьці эканамічных дыктатараў Эўропы заб'е гэтую слабую мясцовую прамысловасьць драбнейшых, асабліва новастворaных дзяржаваў. Ня можа быць сумліву, што зламаньне платоў ды „дзьвярей у іх хату“ заб'е некаторыя з гэтых дзяржаваў ня толькі гаспадарча, але з часам і палітычна...

Калі мы успомнім, што адным з галоўных чыньнікаў гэткага гаспадарчага адраджэньня Эўропы зьяўляецца Нямеччына, што немцы першыя зрабілі спробы аб'яднаньня цэлага раду галін прамысловасьці, як напрыклад эўропэйскія трэсты—сталёвы, ці хімічны, што немцы будуць і галоўнымі кіраўнікамі ўва ўсей гэтай вялізарнай працы, як былі і да вайны, — дык можна зразумець, якую вялізарную карысьць для нямецкай палітыкі дасьць гэтая „гаспадарчая Пан-Эўропа“. Ізноў, як да вайны, немцы становяцца ў цэнтры гаспадарчага жыцьця Эўропы...

Вось, якое заблутанае зьявішча прадстаўляе распачатая канфэрэнцыя.

Асабліва цікаўна ўчасьце ў яе працах прадстаўнікоў Радавага Сацыялістычнага Саюзу. Супрацоўніцтва абедзьвюх процілежных сыстэмаў сацыяльна-гаспадарчых, ведама-ж, немагчыма. Але сутычнасьць іх, пэўна-ж асьветліць — у ідэйнай барацьбе — усе небясьпекі, якія суліць палітычным адносінам у Эўропе гаспадарчыя перабудовы.

Дык першая міжнародная гаспадарчая Канфэрэнцыя дзеля гэтага робіцца ў кожным разе падвойна цікаўнай.

На гаспадарчай Канфэрэнцыі.

Адчыненьне Канфэрэнцыі.

4-га траўня ў Жэнэве ўрачыста адчынілася Міжнародавая Гаспадарчая Канфэрэнцыя. Старшынёй выбраны б. бэльгійскі прэм'ер Тэніс. Зьехаліся дэлегаты 47 дзяржаваў, у тым ліку і ССРР.

Заявы Старшыні радавай дэлегацыі.

Старшыня радавай дэлегацыі Асінскі заявіў нямецкім журналістам, што радавы ўрад ніколі не адмаўляўся ад учасьця ў канфэрэнцыях, якія ставілі сабе мэтай разгляд справаў, маючых вялікую міжнародавую вагу, — незалежна ад таго, ці склікала іх Ліга Народаў, ці хто іншы. Радавая дэлегацыя, прымаючы ўчасьце ў канфэрэнцыі, лічыць сваей задачай:

1. высказаць пагляд публічнай апініі ССРР на сучаснае гаспадарчае палажэньне сьвету і на труднасьці яго аздараўленьня;
2. зрабіць ад імя радавага ўраду прапазыцыі, маючыя на мэце зьліквідаваць гэтую хранічную хваробу крызісаў гаспадарчага жыцьця капіталістычнага сьвету;
3. зрабіць даклад аб рэзультатах гаспадарчай адбудовы ССРР, дакананай на падставах новага сацыялістычнага ладу;
4. прадставіць варункі, на якіх было-б магчыма сумежнае істнаваньне дзьвюх працоўных сыстэмаў гаспадаркі: капіталістычнай і сацыялістычнай;
5. зрабіць рад выясьненьняў ды прапазыцыяў у справах, зьвязаных з мірнымі трактатамі.

У канцы Асінскі дадаў, што радавая дэлегацыя маніцца працаваць у цесным кантакце з нямецкай, бо ССРР мае шмат супольных інтарэсаў з Нямеччынай.

Праграма працы Канфэрэнцыі.

Англійская прэса дае праграму працы Канфэрэнцыі. Праграма складаецца з 3-х частак. Першая мае выясьніць прычыны крызісу ў сусьветным гандлю ды ўплывы гэтага крызісу на... трываласьць сусьветнага міру!... (хто аб чым, а англійцы заўсёды аб гандлю). Другі аддзел працы Канфэрэнцыі мае датычыць справаў мытных граніцаў, ці абмяжаваньняў ўвозу і вывазу з боку пасобных дзяржаваў, шкодных ізноў для сусьветнага гандлю (ізноў англійцы — аб гандлю)...; апрача таго, маюць быць тут абгавораны справы разьвіцьця ды аб'яднаньня прамысловасьці. Трэці аддзел Канфэрэнцыі займецца справамі сельска-гаспадарчай прадукцыі ды адносінаў яе да прамысловасьці.

Прамова старшыні Канфэрэнцыі.

Старшыня Тэніс у сваей прамове сказаў, што гэтая першая Канфэрэнцыя, зразумела, толькі распачне працу гаспадарчага аздараўленьня сьвету, але праца гэтая — вялікая, цяжкая, дык патрабуе яшчэ шмат часу і добрай волі дзяржаваў. Першая справа Канфэрэнцыі — гэта зьменшыць вышыню „мытных загарадак між дзяржавамі“, такіх шкодных для міжнародавага таргового ды іншага абмену.

Канфэрэнцыя, сказаў ён, мае працягнуцца да 21-га траўня.

Першым віцэ старшынёй выбраны францускі дэлегат, добра ведамы эканаміст, былы міністар Лэшэр.

Выступленьне дэлегацыі ССРР.

Швайцарскае агенцтва даносіць, што прамова старшыні Радавай дэлегацыі Сакольнікава на Канфэрэнцыі выклікала вялікую зацікаўленасьць. Сакольнікоў даў вельмі цікаўны абраз і вывады з таго вялізарнага дасьледу і працы, якія зроблены за апошнія гады ў ССРР — у галіне гаспадарчай адбудовы Саюзу. Аратар даводзіў, што пачатныя нячуваныя цяжары гэтай працы мелі прычынай пераважна вялізарныя спусташэньні ад ваенных падзей, а пасьля — хатняй вайны ды чужаземнай інтэрвэнцыі вялікіх капіталістычных дзяржаваў.

З асаблівым націскам падчырківаў радавы дэлегат адбудову сельскай гаспадаркі ў ССРР. Разьвіцьцё прамысловасьці ідзе паволным тэмпам, але паводле дакладна апрацаванага пляну. Няспыняючаеся безрабоцьце падтрымліваецца пераважна палітыкай недаверыя з боку капіталістычных дзяржаў, якія ня пускаюць сваіх капіталаў у ССРР, але, наадварот, яшчэ імкнуцца да поўнага абасобленьня ССРР ад рэшты сьвету.

Што датычыць значна спаўшага—у параўнаньні з даваенным — заграничнага гандлю ССРР, дык гэта зьявішча мае свае прычыны ў тым, што цяпер шмат павялічылася ўнутранае спажываньне сельска-гаспадарчых ды прамысловых прадуктаў насяленьнем саюзных краёў, дабрабыт якога значна ўзрос.

У заключэньне сваей прамовы, слуханай з вялікай увагай, дэлегат ССРР, яго камісар Скарбу, Сакольнікаў выразіў надзею, што капіталістычныя дзяржавы ўвойдуць у бліжэйшыя адносіны з Радамі. Бо-ж гэта найбольш прычынілася-б да зьдзейсьненьня мэты Канфэрэнцыі — да падняцьця гаспадарчага дабрабыту ўсіх краёў, як роўна і да забясьпечаньня сусьветнага міру. Што-ж датычыць частых абвіненьняў ССРР у „чырвоным імпэрыялізьме“, дык гэта — мана.

Пасьля Сакольнікава другі дэлегат ССРР, Абалэнскі (Асінскі), востра скрытыкаваўшы гаспадарчую палітыку капіталістычных дзяржаваў, якая давяла да сучаснага адчайнага палажэньня, запрапанаваў — ад імя дэлегацыі — цэлую праграму радыкальных мераў дзеля ратаваньня сьвету ад катастрофы. Перадусім павінны быць цалком ды ўзаемна скасаваны ўсе ваенныя даўгі, павінна быць загарантавана поўная свабода работніцкім прафэсыянальным арганізацыям, свабода забастовак і г. д.; зараз-жа трэба скасаваць усялякія „пратэктараты“ ды „мандаты“ імпэрыялістычных дзяржаваў, якія крыўдзяць слабейшыя народы; павінна быць забясьпечана свабода для ўсіх народаў сьвету, свабода іх уласнай гаспадарчай палітыкі (якую якраз Канфэрэнцыя хоча абмяжаваць)... Павінна зараз-жа быць спынена ўсялякая ваенная акцыя дзяржаваў у Кітаі, спынены ўсялякі байкот эканамічны ды палітычны ССРР капіталістычнымі дзяржавамі. Урэшце павінна быць дакананa запраўднае ды шчырае разбраеньне ўсяго сьвету, — скасаваньне сталых арміяў і ваеннага флёту.

Лёгка зразумець, якія шансы выкананьня мае гэткая праграма на Канфэрэнцыі...

7-га мая ўвечары скончылася агульная дыскусія на Канфэрэнцыі.

Прамова Люшэра

Апошнім прамаўляў францускі дэлегат Люшэр, які сьцьвярдзіў, што няма запраўднага міру — без эканамічнага разбраеньня дзяржаваў. Ён запрапанаваў стварэньне сталага органу — Міжнародавай Гаспадарчай Рады, якая будзе прадаўжаць працу Канфэрэнцыі; усе спрэчкі ды канфлікты гаспадарчага характару трэба перадаваць палюбоўным судам, якія — у сумлівах фармальнага характару — маюць зварачацца да Трыбуналу ў Гаазе. Апрача таго Люшэр прапанаваў шырака карыстацца міжнародавымі прамысловымі аб'яднаньнямі (трэстамі, картэлямі і т. д.).

Процi стварэньня Рады і арганізацыі картэляў рашуча высказаўся дэлегат Італіі.

Узрост палітычнай актыўнасьці Нямеччыны.

Мы ўжо падавалі ў папярэднім нумары азнакі рэзкага ўзросту палітычнай актыўнасьці Нямеччыны. Цэлы рад нямецкіх міністраў і іншых, менш адказных, палітыкаў выступіў з рашучымі заявамі аб несправядлівасьці ды недарэчнасьці граніцаў Нямеччыны з Польшчай, зьмяніць якія нямецкі ўрад стаўляе сабе цьвёрдай мэтай. Менш адказная прэса дык тая папросту дамагаецца звароту на лона нямецкай „мацеры“—ўсяго, што ў яе забрана ў Вэрсалі. Але ўздым нямецкага „добрага самапачуцьця“ зусім не абмежыўся наступам на свайго слабага ўсходняга суседа—Польшчу. Рашучы націск немцы пачалі рабіць і на свайго дужага заходняга францускага суседа.

Сьпярша мін. Штрэзэман „прыватна“, як публіцыст, у аднэй з субсыдыяваных урадам газэт разглядзеў усю недарэчнасьць трываньня саюзьніцкай акупацыі Нямецкай зямлі — пасьля таго, як усе варункі, прадугледжаныя Вэрсальскім Трактатам, немцы споўнілі, а Нямеччына ўвайшла на роўных правох у Лігу, ды паміж Нямеччынай і саюзьнікамі, асабліва Францыяй, усялякія стасункі зрабіліся больш, чым мірныя, бо аж — прыязныя. Трываньне акупацыі цяпер пры гэткіх варунках — павінна толькі псаваць гэтыя добрыя адносіны, выклікаючы ў Нямеччыне абурэньне ды абражаючы яе дзяржаўны гонар. Уся прэса падхапіла артыкул Штрэзэмана, падтрымаўшы яго голас гучна магутным хорам.

На гэтыя дамаганьні нямецкай апініі адказаў вельмі востра францускі прэм'ер Пуанкарэ. У сваей прамове, аб якой мы пісалі, ён заявіў паміж іншым, што Нямеччына далёка яшчэ ня выпаўніла ўсіх варункаў, якімі абставіў Трактат звальненьне яе ад акупацыі.

Прамова Пуанкарэ выклікала страшэннае абурэньне ў Нямеччыне. Нямецкая прэса ізноў падыймае пытаньне, ці палітыка Францыі адносна да Нямеччыны — адна, ці іх аж дзьве: адна—Пуанкарэ, а другая—Брыяна?! Але найбольш характэрна для ўзросту нямецкай палітычнай актыўнасьці, што якраз зараз-жа пасьля вострай прамовы Пуанкарэ нямецкі ўрад загадаў свайму паслу ў Парыжу, каб рашуча зажадаў ад францускага ўраду—калі не скасаваньня, дык прынамся вельмі значнага зьмяншэньня акупацыі.

Уся францускaя прэса, асабліва „народовая“, амаль не ашалела ад гэткай неспадзяванкі!.. Некаторыя газэты з апазіцыі пішуць, што Пуанкарэ, няўдала ўмешываючыся ў справы вонкавай палітыкі, толькі псуе палітычную працу міністра замежных спраў Брыяна.

Нямецкі пасол заявіў Брыяну, што — у выніку заяваў Пуанкарэ ды неспаўненьня слушных дамаганьняў Нямеч. — палажэньне Штрэзэмана можа пахіснуцца, а з ім разам можа паляцець і ўсё тое „Лёкарно“, якое стварылі яны разам з Брыянам („Лёкарно“—паразуменьне Францыі з Нямеччынай). Але, казаў пасол, Нямеччына не дамагаецца, каб акупацыя была спынена зараз-жа цалком. Нямеччына толькі папераджае, што афіцыяльна ды рашуча выступіць з гатым трэбаваньнем — у палове чэрвеня, калі праца над збурэньнем крэпасьцяў на ўсходняй граніцы (з Польшчай) будзе скончана.

Што адказаў Брыян нямецкаму паслу, няведама. Але характэрна, што амаль не на другі дзень Рада Паслоў (саюзьніцкіх) занялася справай рашучага зьмяншэньня лічбы акупацыйных войск у Нямеччыне.

Такім чынам, ясна, што ізноў у „барацьбе“ між Пуанкарэ і Брыянам быў пабіты Пуанкарэ, які, можа, лятуціць аб павароце тых слаўных часоў, калі ён мог камандаваць у Нямеччыне, як у сябе дома.

Цікаўна ў гэтым усім адзначыць, што ўзросту нямецкай актыўнасьці ў значнай меры памаглі апошнія здарэньні ў Кітаі. Як? Ды вельмі проста. Перадусім, радавы ўрад пасьля няўдачы ў Кітаі прыпыніў актыўнасьць сваей палітыкі на Далёкім Усходзе, зрабіў там „перадышку“, перакінуўшы свае сілы на „заходні фронт“. А гэтым адразу ўсіліў свайго саюзьніка на захадзе—Нямеччыну. З другога боку, таксама і Англія, адхіліўшы часова ад сябе — дзякуючы здрадзе Чанг-Кай-Шэка — беспасярэднюю небясьпеку ў Кітаі, у значнай меры супакоілася. У выніку гэтага зараз-жа зьмянілася ўся тая „новая“ англійская палітыка — значных уступак Францыі ды прыхільнасьці да Польшчы, якая толькі-што так востра скіроўвалася Англіяй—проці Нямеччыны. Паміж іншым, Польшча была Англіі яшчэ ўчора раптам нагвалт патрэбна, каб ціснуць на Маскву, адцягаючы яе ўвагу ад Далёкага Усходу — пагрозай на Блізкім Захадзе. Цяпер небясьпека для Англі ў Кітаі прыпынена, дык і вялікая патрэба польскіх услугаў сьсэзла. А тутака яшчэ Нямеччына робіцца на-гвалт патрэбнай у тэй новай працы „гаспадарчай адбудовы“ Эўропы, ці крыху прасьцей: адбудовы англійскага гандлю, які ўсьцяж занепадае. На Жэнэўскай Міжнародавай Гаспадарчай Канфэрэнцыі Англія хоча мець на сваім баку, але ня проці сябе, наймагутнейшы гаспадарчы арганізм эўрапэйскага сухапуцьця Нямеччыну,—паміж іншым дзеля таго, каб змусіць усе другарадныя дзяржавы, а перадусім слаба-прамысловыя новатворы, каб падпарадкаваліся эканамічнай дыктатуры магутнейшых прамысловых „імпэрыяў“, на чале якіх ізноў хоча стануць Англія. Дзеля таго—у спорцы паміж Нямеччынай і Польшчай (і Францыяй) Англія ізноў рашуча выбірае Нямеччыну.

Як бачым, сіла Нямеччыны — у тым, што — як толькі сусьветная палітыка тэй ці іншай дзяржавы ставіць задачу творчай гаспадарчай адбудовы сьвету, Нямеччына высоўваецца на першы плян, як наймагутнейшы чыньнік гэтай палітыкі, з якім ня можа канкураваць ані Францыя, ані, зразумела, Польшча...

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

У справе заграничнай пазыкі.

Газэты пішуць, быццам усе справы, зьвязаныя з заграничнай пазыкай для Польшчы, ужо абгавораны ды высьветлены. Варункі аканчальна ўстаноўлены. Фінансавая Рада высказалася за карыснасьць пазыкі дый—за тое, каб польскі злоты быў устабілізаваны больш-менш на роўні яго сучаснага курсу (каля 9 за даляр),—інакш кажучы, Рада прыняла гэты варунак чужаземных банкіраў. Гэткім чынам, пішуць газэты, цяпер астаноўка толькі за аканчальным рашэньнем марш. Пілсудскага.

У папярэднім нумары мы высьвятлялі—на падставе газэтных вестак, як ускладняецца справа пазыкі—ў сувязі з дамаганьнямі банкіраў, каб была пераробленa ўся падаткавая сыстэма ў Польшчы. Мы казалі, што гэтага ня можна — прынамся законным шляхам — зрабіць бяз Сойму, але, — казалі мы сьледам за цэлым радам газэтаў, — склікаць Сойм неяк неахвоцен польскі ўрад. Пісалі газэты і аб тым, быццам урад хоча правясьці пазыку бяз учасьця Сойму, хаця гэта пярэчыць Канстытуцыі. Што гэта магчыма, відаць хаця-б з таго, што навет пас. Строньскі даводзіў у „Варшавянцы“, што ўрад мае права зрабіць пазыку бяз Сойму...

Дык, вось і цяпер газэты пішуць, што з усіх гэтых камплікацыяў ды „канстытуцыйных сумліваў“ можа вывясьці справу пазыкі — аканчальная пастанова марш. Пілсудскага...

Справа пазыкі на Радзе Міністраў.

6-га траўня адбылося паседжаньне Рады Міністраў, на якім — у яго сакрэтнай частцы—абгаварывалася справа пазыкі. Паводле вестак жыдоўскай прэсы, Рада Міністраў, выслухаўшы даклад мін. скарбу і пагляды Фінансавай Рады, „аднагалосна зацьвярдзіла ўсе варункі пазыкі, апрацаваныя ў паразуменьні з прадстаўнікамі амэрыканскіх банкіраў“. Гэткім чынам, быццам справа можа лічыцца скончанай. Адно, вось, на гэтым паседжаньні ня было толькі — галавы габінэту, самога марш. Пілсудскага!.. Дык правая прэса інфармуе, можа, правільней, кажучы, што — без свайго шэфа „п. п. міністры ня сьмелі аканчальна сказаць: так ці не“.

Каб толькі паны міністры не прапусьцілі добрага мамэнту. Бо зацікаўленасьць Англіі Польшчай — пасьля перамогі ў Кітаі — падае катастрафічна.

А пазыка робіцца для Польшчы ўсё больш—на гвалт—патрэбнай. Бо ж—у выніку абшарніцкай палітыкі мін. Незабыткоўскага, які выпусьціў з краю вялізарныя масы збожжа заграніцу, цяпер прыходзіцца — за дарагую цану — увозіць ізноў у край заграничны хлеб. З гэтай прычыны галоўным чынам стаў шпарка спадаць добры гандлевы балянс Польшчы (звышка вывазу над увозам), ад якога ў Польшчы залежыць у вялікай меры трываласьць валюты. І вось, у сакавіку таргова балянс ужо ня даў зусім гэтай карыснай для краю перавышкі. Для красавіка яшчэ лічбаў няма, але можна думаць, што яны будуць яшчэ горшымі. Гэткім чынам, паўтараецца ізноў абраз пачатку 1925 г., калі ў яго сярэдзіне толькі-што спароджаны Грабскі злоты так страшэнна заламаўся.

Дык ясна, што без пазыкі можа быць ізноў вельмі дрэнная справа.

Водгукі прамовы Гэргта ў польскай прэсе.

Польская прэса, асабліва правая, страшэнна абураецца на прамову нямецкага мін. справядлівасьці Гэргта ў Сілезіі. Прэса падчырківае, што Гэргт—віцэ-прэм'ер нямецкага ўраду, дый прамова сказана над самай польскай граніцай. Асабліва абурае палякоў мейсца ў прамове, дзе Гэргт казаў, што задачай нямецкага грамадзянства — „стварыць адзінства думак ды пачуцьця на суцэльным абшары ўсяе Верхняе Сілезіі (як нямецкай, таксама і польскай часткі яе!), несправядліва ды штучна падзеленай саюзьнікамі. Прэса заклікае польскі ўрад да адпаведнага адказу на такую правакацыю.

Ізноў — „Блёк Нацыянальных Меншасьцяў“?

„Роботнік“ паведамляе, быццам Блёк нацыянальных меншасьцяў, маючы выступіць на новых выбарах, стаўся ўжо фактам. У Блёку прымаюць удзел, як кажа газэта,—жыды-сіовісты ды ортодоксы, Украінскае Нацыянальна-Дэмакратычнае Аб'яднаньне („Ундо“) і нямецкія нацыяналісты. Усе — буржуазныя кірункі. Аб літвінох газэта ня кажа. За тое дадае, што — ніводная беларуская група не ўваходзіць у Блёк.

Чаго-ж гэта марудзіць пас. Ярэміч?

Зьмяншэньне лічбы паліцыянтаў у Польшчы.

Міністэрства ўнутраных спраў пастанавіла ад 1 траўня зьменшыць лічбу вышэйшых паліцыянтаў у Польшчы ўсяго на 348 мейсц.

Забойца прэзыдэнта Лодзі засуджаны на сьмерць.

Даразны суд у Лодзі засудзіў на сьмерць забойцу прэзыдэнта м. Лодзі п. Цынарскага. Абарона падсуднага Валашчыка зьвярнулася да п. Прэзыдэнта Рэспублікі аб памілаваньне. Прэзыдэнт не скарыстаў з свайго права памілаваньня, і забойцу скаьнілі...

Заграніцай.

„Урад вышэйшай сілы“.

Літоўскія фашысты, якія разграмілі лявіцу, выгналі з ураду пасьля таго хрысьціянскіх дэмакратаў і апіраюць сваю дыктатуру ў Літве выключна на арміі. Але ўрадавая прэса ўсьцяж выхваляе мудрасьць ды магутнасьць гэтага ўраду, пішучы, што ўрад мае шмат прыхільнікаў сярод інтэлігенцыі, работнікаў ды сялянства. Орган Вальдэмараса піша паміж іншым, што выхад хрысьціянскіх дэмакратаў з ураду нічога не пашкодзіў яго сіле, бо ўрад гэты атрымаў сваю ўладу з волі „вышэйшых чыньнікаў“. „Новая апазыцыя для ўраду—ня страшная, бо-ж урад мае сільнейшыя нэрвы, як апазыцыя“.

Што гэта за „вышэйшыя чыньнікі“ добра ведаем і мы тутака...

Англійскі націск на Літву.

Ведамы пасол Вэджвуд запытаўся на паседжаньні англійскага парляманту ў Чэмбэрлена, ці запраўды паслы Англіі, Францыі ды Італіі зрабілі націск на літоўскі ўрад, каб Літва пагадзілася з Польшчай, ды адмовілася ад сваіх прэтэнсіяў на Вільню?. Чэмбэрлен быццам адказаў, што гэты крок зроблены—ў інтарэсах агульнага міру, дый што Англія асабліва заінтэрасавана ў усталеньні

добра — суседзкіх адносінаў паміж Літвой і Польшчай.

Карэспандэнт „Кур. Варш." даведаўся, быццам літоўскі ўрад на гэты націск паслоў вялікіх дзяржаў адказаў „недарэчна", гэта значыць—адмоўна.

Уцякаюць з фашыстаўскага „раю" ў Літве.

У апошні час, як паведамляюць газэты, страшэнна ўзрасла эміграцыя з літоўскага фашыстаўскага „раю". У адным прошлым месяцы з Літвы толькі ў Бразылію выехала каля 6 тыс. асоб.

Разгром літоўскіх эс-эраў у Коўні.

Літоўскія фашысты ўсьцяж робяць пагромы ўсялякай апазыцыі. 1 і 2 траўня адбыліся вобыскі ды арышты сярод літоўскіх эс-эраў; паміж іншым паліцыя сканфіскавала ўвесь архіў партыі.

Як паведамляе „Усх. Агенцтва", гэты архіў даў доказы зносінаў літоўскіх эс-эраў з маскоўскімі ды бэрлінскімі камуністамі.

Літва мае чакаць—„добрае нагоды".

Літоўская ўрадавая газэта зьмяшчае цікаўны артыкул, у якім кажа аб тым, што павінна Літва рабіць, каб вярнуць сабе Вільню. Літва можа мець надзею вырваць Вільню з сільных ды цэпкіх рук Польшчы толькі ў разе вайны вялікшых дзяржаваў, у якую будзе ўвязана Польшча. І вось такая вайна яўна ды няўхільна насьпявае, а гэтым самым насьпявае і магчымасьць для Літвы—здабыцьця Вільні. Нямеччына неяк прымірыўшаяся з стратамі на Захадзе, усьцяж рыхтуецца да вайны на Усходзе, каб адабраць ад Польшчы забраныя землі. Але ясна, што Польшча бяз бою не аддасьць іх. Дык барацьба павінна быць страшэнная, і Літве трэба сачыць вельмі ўважна, каб не прапусьціць мамэнту.

Узнаўленьне радава-літоўскіх targовых перагавораў.

4 траўня распачаліся ў Маскве перагаворы паміж радавай і літоўскай дэлегацыямі ў справе заключэньня торговай умовы.

Узнаўленьне перагавораў між ССРР і Латвіяй.

3-га траўня прыбыўшая ў Маскву латвійская дэлегацыя ўзнавіла перагаворы з радавым урадам у справе заключэньня гаранцыйнага і гандлёвага трактатаў.

Скасаваньне пашпартоў у ССРР.

Рада Народных Камісараў выдала дэкрэт аб скасаваньні пашпартоў у ССРР. Замест пашпарту асабістасьць можа быць сьцверджана цэлым радам іншых дакумэнтаў, як гэта ёсьць у цэлым радзе заходніх культурных дзяржаваў.

Адозва „Сталёвага Шалому"

Зьезд нямецкіх арганізацыяў былых вайсковых—„Сталёвы Шалом" зьвярнуўся з адозвай да ўсяго насяленьня краю. У адозьве зьезд заяўляе, што не прызнае накінутага Нямеччыне Вэрсальскага Трактату, ды зьвязаных з ім далейшых, таксама прымусовых, умоваў. „Сталёвы" зьезд дамагаецца скасаваньня абвінненьня Нямеччыны ў выкліканьні вайны. Далей зьезд трэбуе безадкладнага зьняцьця акупацыі над Рэйнам і папраўленьня ўсходніх граніцаў (з Польшчай). Адозва дамагаецца ўвядзеньня ізноў былых імпэратарскіх калёраў на дзяржаўным сьцягу—замест новых рэспубліканскіх.

У заключэньне адозва заклікае да барацьбы з камунізмам, трэбуе манархізацыі ўлады прэзыдэнта і — шырокай ваенна-асадніцкай палітыкі на паграніччы з Польшчай.

Прэзыдэнт Гіндэнбург і мін. Штрэзэман— у справе зьезду.

Левая нямецкая прэса піша, што, як прэзыдэнт Гіндэнбург, таксама і мін. Штрэзэман, — каб уцячы ад запросінаў на зьезд „Сталёвага Шалому", пастановы якога — у іх прысутнасьці на зьезьдзе—могуць выклікаць дыпляматычныя канфлікты, пастанавілі выехаць з Бэрліна. Прэзыдэнт паехаў на аб'езд краю, а Штрэзэман—у водпуск на адпачынак.

Разьвіцьцё нямецкага флёту.

Італьянскае Статыстычнае Бюро падае цікаўныя даныя аб разьвіцьці будаўніцтва караблёў у розных дзяржавах сьвету.

Цікаўна, што ў леташнім годзе Італія стаяла на другім месцы ў гэтай галіне, на першым—Англія. Але сёлета другое мейсца заняла Нямеччына, адсунуўшы Італію — на трэцяе. Пасьля ідуць — Амэрыка, Францыя, Галяндыя.

Сэнсацыйны праект.

Адзін з найбольш уплывовых англійскіх палітыкаў, уласьнік цэлага раду вялікіх газэтаў, лёрд Ротэрмэр, выступіў з праектам, каб Англія ўступіла свой „мандат" на Палестыну і Мэсапатамію—Італіі.

Ведама, што перад вайной гэтыя краі былі пад дзяржаўнай уладай Турцыі, а пасьля пабеды саюзьнікаў Англія і Францыя падзялілі між сабой значную частку турэцкіх валадзеньняў, якія для прызвaітасьці былі Лігай Народаў аддадзены ім пад упраўленьне: пад апеку ды ахову... Фактычна, ведама-ж, ніякай самастойнасьці гэтыя краі ня маюць, а камандуюць там, як у сваіх калёніях, іх „мандатары".

Італьянская прэса спаткала, ведама-ж, гэты праект з вялікім захапленьнем. Пішуць, быццам асабліва заінтэрэсаваўся гэтым праектам і рымскі Папа, які пэўна-ж будзе мець у Палестыне—з дапамогай італьянскага ўраду—рашучую перавагу над усімі іншымі царквамі.

Закон проці работніцкіх арганізацыяў прыняты ангелійскім парлямантам.

Ня гледзячы на страшэнную барацьбу работніцкіх паслоў у парляманьце проці ўрадавага законапраекту, які значна абмяжуе правы работніцкіх арганізацыяў і забараняе абвяшчаньне палітычных забастовак, а перадусім—агульнай забастоўкі работнікаў дзеля націску на ўрад,—законапраект гэты прыняты вялізарнай большасьцю кансэрватараў — проці работніцкіх і лібэральных галасоў.

Спадзяюцца, што тасаваньне закону будзе выклікаць у будучыні вострыя сацыяльныя канфлікты.

Англія ўсьцяж рыхтуецца да паходу на Кітай.

Ня гледзячы на разгром — у хатняй вайне — Кантонскага ўраду, Англія ўсьцяж рыхтуецца да ваеннага паходу на Кітай, манючыся выкарыстаць да канца сваю мілітарную сілу, якой цяпер не пагражае нішто. — Бо-ж абодва Чангі пакуль што б'юць адзін аднаго.—Трэба думаць, што Англія з Японіяй напросту падтрымліваюць абодвух, каб чым больш зьнішчожылі кітайскай сілы. А тады лёгка будзе дыктаваць сваі варункі пабітаму сваімі-ж рукамі народу. Англія ўсьцяж шлець у Кітай аэрапляны, жаўнераў, амуніцыю. Яна мае там ужо больш як... 40 тысячную армію, ня лічучы флёту.

Завастрэньне англійска-кітайскіх адносінаў

Англійскія ваенныя караблі, якія ходзяць па вялізарнай рацэ Ян-Цзэ, страшучы насяленьне, усьцяж абстрэліваюцца з кулямётаў ды ружжаў з берагоў. Дагэтуль ангелійскае камандаваньне быццам загадывала сваім караблям унікаць усялякіх ваенных сутычак з насяленьнем. Але цяпер яно загадала наадварот—рашуча адказываць на ўсе стрэлы ды іншыя варожыя акты бамбардаваньнем берагоў.

Няўдачная пераправа Чанг-Кай Шэка.

Армія Чанг-Кай-Шэка зрабіла ў некалькіх мейсцах спробы пераправіцца на паўночны бераг Ян-Цзэ, каб вясьці абяцанае наступленьне на Пэкін. Але паўночная армія ўраганным агнём сваей (мо' японскай?!) артылерыі спыніла ўсе гэтыя спробы.

Новая радавая нота Пэкінскаму ўраду.

Радавы ўрад паслаў Пэкінскаму ўраду ноту, у якой вельмі рэзка пратэстуе проці гвалтаў над арыштаванымі расейцамі, заяўляючы, што Масква ня будзе спакойна глядзець на расправу з імі.

Капітуляцыя паўстанчага руху ў Нікарагуа.

Генарал Монкада, павадыр партыі лібэралаў, што паднялі паўстаньне ў Нікарагуа проці ўраду, які прадаўся Амэрыканскім Штатам,—заявіў, што паўстанцы гатовы злажыць аружжа. Як ведама, ураду Нікарагуа давалі зусім адкрыта грошы, аружжа, навет гатовае войска і флёт—амэрыканскія ўлады, з якімі канкураваць слабыя паўстанцы, навет падтрыманыя вялізарнай масай народу, не маглі. І то паўстаньне трымалася так доўга толькі дзякуючы помачы з боку Мэксыкі. Дык—як толькі мэксыканскі ўрад пачаў неяк паразумявацца з амэрыканскім, дык далей нікарагуанскія паўстанцы больш трымацца ня здолелі.

У майскі вечар.

Майскі вечар... Мястовыя вуліцы
Электрычнасьцю яркай залітыя...
Ціха лісьце да ваконьня туліцца,
Нібы казкі шапоча забытыя...

Там на вуліцах рух нясьціхаючай
людзкай хвалі ля вокан, ля сьцен...
Я хачу ухаціць, разважаючы,
Яе рытму прысьпешнага сэнс.

1927 Н. Ільяшевіч.

ХРОНІКА.

Прыгавор у справе „33". Судовы працэс 33-х беларусаў — бадай выключна сялян з Наваградчыны — закончыўся пасьля 5-дзённае расправы вельмі суровым прыгаворам. Суд прызнаў 19 абвінавачаных — вінаватымі ў учасьці ў змове, якая мела на мэце адарваць Заходнюю Беларусь ад Польшчы і далучыць да Радавае Беларусі. Засуджаны: Ян Макоўскі — **на 12 г. катаржнае турмы**, Браніслаў Янцэвіч — **на 10 г.**, Міхал Блюшка і Уладзімер Пушкарскі — **па 7 гад.**, Язэп Клінка, Эдмунд Бруска, Бэрнард Нэсэн, Браніслаў Каладзейскі, Базыль Рачынскі, Казімір Зэрка, Брунон Кубязоўскі і Міхал Ісенка — **па 6 г.**, Павал Альховік, Аляксандар Альховік, Мікалай Шарапа, Ян Васілевіч, Антон Лысы і Аляксандар Ваўчак — **па 4 гады**, Люцыян Ваўчак — **на 1½ году папраўчага вастрогу.** Трынаццацём залічаны сьледчы арышт ад 2 месяцаў да 2 гадоў. 9 абвінавачаных, якія адказвалі з волі, тутжа былі заарыштаваны.

Старшынстваваў на судзе судзьдзя Аўсянка.

Спекуляцыя на „Грамадзе". Аказваецца, што не адны толькі сельсаюзьнікі стараюцца пры агітацыі на вёсцы падшывацца пад „Грамаду": па іх сьлядох пайшлі і адшчапенцы ад НПХ—так-званая „Радыкальна Партыя Влосьцяньска Зем Бялорускіх", утвораная пасламі Бонам, Шапелем і Шакуном. Гэтая „тройка" збанкрутаваных „палітыкаў", якія, як ведама, былі выбраны ў Сойм пад фірмай „Вызваленьня" за дэфэнзыўныя грошы, маніцца перахапіць грамадаўскія ўплывы ў сялянскіх масах Заходняе Беларусі і праз эндэцкую газэту „Дзеньнік Віленьскі" публікуе брахлівыя весткі аб нейкіх „канфэрэнцыях" і „ўгодах" з грамадаўцамі.

Вось-жа нас просяць адзначыць, што ніхто з паважнейшых былых грамадаўскіх дзеячоў ня толькі ня мае нічога супольнага з гэнымі панамі, але й гаварыць з імі ня мае ахвоты,—дык і вестка аб „вялікай нарадзе" з грамадаўцамі ажно з дзевяцёх паветаў Зах. Беларусі, якая быццам закончылася ўваходам б. грамадаўцаў у партыю гэнае „тройкі", зьяўляецца звычайнай хлусьнёй і найлепш гавора аб тым, што за „фрукты" гэныя паны-паслы...

Правакацыйнае пісьмо. Нядаўна „Сялянская Ніва" надала была вестку аб арышце паліцыяй яе рэдактара грам. Міцько, якога аднак „выбраў" спад арышту пасол Ярэміч. Але пан рэдактар аказаўся больш, чым няўдзячным свайму выбавіцелу: ён зьмясьціў у абшарніцкім „Слове" пісьмо гэткага зьместу, разьвітаючыся адначасна і з рэдакцыяй „С. Н.", і з сельсаюзам:

„Паважаны Пане рэдактару! Ветліва прашу зьмясьціць гэтыя некалькі слоў. Дзеля таго, што Сялянскі Саюз, кіраваны пасламі Ярэмічам і Рагуляй, апошнімі часамі стараецца насьлодаваць як праграму, так і тактыку Грамады, што зрабіла гэтулькі шкоды і няшчасьцяў Беларускаму Народу, я ніжэйпадпісаны, не жадаючы мець нічога супольнага з палітычным кірункам, які свае сілы маніцца будаваць на ненавісьці і клясавым змаганьні, — гэтым заяўляю, што выступаю з Сялянскага Саюзу. — Люцыян Міцько, былы рэдактар „Сялянскае Нівы".

Пісьмо гэтае мае выразна правакацыйны характар, бо ж і кірунак, і тактыка сельсаюзу — лішне добра ўсім ведамы і яўна варожыя грамадаўскаму кірунку. Ды так яно заўсёды бывае з людзмі тыпу грам. Міцька: быў жа ён некалі сэкрэтаром соймавае фракцыі Грамады, скуль яго звольнілі, пасьля перакінуўся на-права — да сельсаюзу, а згэтуль коціцца яшчэ далей—ведама куды...

Цікавае зьявішча. З аднаго боку бышы „прававерны" сельсаюзьнік здраджае імкненьні „Сялянскага Саюзу", які бязумоўна і перш яшчэ высазываў сваю тэндэнцыю спрычыніцца да зьнішчэньня Грамады, каб пасьля заняць яе месца ў беларускім руху пад Польшчай. Гэта для нас ня навасьць. Бяда толькі, што ніяк сельсаюзнікам пляны іхныя не ўдаюцца, мусіць ужо па таму закону, аб якім пісаў Максім Горкі, што „рождённы ползать — летать не может". Бо ўсё роўна якім быў „Сялянскі Саюз" у часе істнаваньне Грамады — такім застаўся і пасьля яе ліквідацыі, па форме і па сіле, а па зьместу дык, відаць, яшчэ больш апашлеў.

З другога боку цікава, што Сялянскі Саюз, які так стараннa шукаў здраднікаў і ворагаў беларускае справы ў рэдакцыях „Народнага Звону" і Нашай Справы" сярод супрацоўнікаў гэтых рэдакцыяў, ня відзіў, што на сваіх уласных грудзёх узгадоўвае „зьмяю" у асобе рэдактара „Сялянскай Нівы" Міцькі, які таксама за ўвесь час свайго рэдактарства палявaў усё на здраднікаў. А цяпер? А цяпер ліст, цытаваны тут з „Słowo" гаворыць сам за сябе.

Лекцыя др-а Дварчаніна. У мінулую суботу ў Цэнтральным Гуртку Т-ва Белрускае Школы ў Вільні чытаў лекцыю аб найнавейшай беларускай поэзіі д-р Ігнат Дварчанін. Лектар даў рад крытычных нарысаў паасобных поэтаў спаміж пішучых у Заходняй і Усходняй Беларусі. З увагі на тое, што якраз у мінулую суботу, 7 мая, прыпадалі ўгодкі сьмерці К. Сваяка, лектар памянуў і яго, ды запрапанаваў прысутным ушанаваць памяць памёршага год назад поэта ўстанаваньнем. Уся саля, перапоўненая слухачамі, паднялася, — сядзеў адно толькі прадстаўнік улады, паліцыянт...

Не затрымліваючыся на высказаных лектарам паглядах і думках, мы мусім зьвярнуць увагу на адну рэч, якая мае шырэйшае значэньне для ладжаных лекцыяў аб літэратуры. Нельга вымагаць, каб літэратурны крытык быў адначасна і добрым дэкляматарам, — дый гэта рэдка знаходзіцца ў аднэй асобе. Вось-жа мы-бы радзілі і грам. Дварчаніну, і ўсім іншым лектарам, каб дзеля чытаньня адрыўкаў з крытыкаваных аўтараў запрашалі нашыя мастацкія сілы з беларускага тэатру. А то лектар, не падгатаваны да дэклямаваньня, шмат памяншаў уражаньне ад чытанага от так, звычайна, а не дэклямаванага, ня здолеўшы выявіць усяе мілагучнасьці і гуковае красы поэтыцкіх твораў.

Гэта ўвага агульная, датычыць роўна ўсіх лектароў. Хай-жа з яе скарыстаюць дзеля дабра і справы і свайго!

Вечар поэтаў. Замест чарговая лекцыі ў суботу, 14-га мая, Цэнтральны Гурток Т-ва Беларускае Школы ладзіць у сваім памяшчэньні (вул. сьв. Анны 2) аўтарскі вечар нашых маладых поэтаў. Каля дзесяцёх аўтараў будуць чытаць свае творы. Прыме ў вечары ўчасьце і ведамая наша поэтка Натальля Арсенева, якая мае дзеля гэтага спэцыяльна прыехаць у Вільню. Уступное слова скажа грам. Ант. Луцкевіч.

Мы горача вітаем гэтую навіну, якую ўводзе Т-ва Беларускае Школы да сваіх лекцыяў.

Афіцыяльны курс грошы на 10 траўня. Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

10./V. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

З жыцьця Горадні.

✕ **Водгукі маёвага сьвята працы.** Ужо за пару дзён да сьвята па ўсім горадзе зачалі адбывацца вобыскі і арышты сярод прафэсіянальных і палітычных дзеячаў (ведама, тых не чапалі, якія самы сябе рэклямуюць „вялікімі дзеячамі"). Тое самае адбывалася па ўсім павеце. Так што загадзя можна было прадбачыць, што аб ніякім абходзе Сьвята Працы ня можа быць і гутаркі. Гэты самы выпадак і выкарысталі пэпээсы і бундаўцы, ды за 2 дні да 1-га мая па ўсім горадзе паразьлепліваді вялікія афішы, у якіх апісывалася праграма „іхняга" сьвяткаваньня і абходу гэтага дня.

Вось настаў і доўгачаканы дзень 1 мая, дзень сусьветнага Сьвята Працоўных. У пэпээсаўскіх афішах і гаварылася, што а 12 гадз. дня з клюбу Рады Прафэсіянальных Саюзаў павінен сфарміравацца паход з работнікаў і работніц, які пройдзе па бакавых вуліцах і павінен разьвязацца каля мяйсцовага тэатру, у салі якога будзе зроблены мітынг. Але што мы бачым? Замест „вялікага" паходу, які дэкляравалі павадыры-пэпээсы, сабралася маленькая кучка (самых сяброў гэтае партыі) асоб каля 20 і з пяяньнем „чырвонага штандару" рушыліся ў кірунку мяйсцовага тэатру. Каля тэатру сустрэў іх натоўп работнікаў, які зачаў над імі падсьмейвацца: „вось—наша—ідуць прадстаўнікі пралетарыяту—кветкі Дашынскіх і Марачэўскіх"!

Вось і ўвайшлі ў тэатр, дзе пэпээсаўскі прэзыдыўм прывітаў сабраўшыхся работнікаў, якія прыйшлі паслухаць, што яны будуць сьпяваць.

Характэрна падкрэсьліць той факт, што пад час чытаньня рэзалюцыі, якую яны вынесьлі на гэтым мітынгу, ніхто не падняў рук. За іхнімі рэзалюцыямі, апроч гэтых 20 асоб (хаця на мітынгу была каля 500 асоб). Так, што на гэтым першамайскім Сьвяце Працы павінны былі неканец зразумець ППС, што яны ніякага ўплыву ня маюць, ня толькі сярод беларускага грамадзянства, але і польскага на землях Заходняй Беларусі.

✕ **„Дабрадзеі".** У горадзенскі суд пакою паступілі заявы аб узысканьні і звароце належных грошы з Беларускага Дабрадзейнага Т-ва пекару 730 зл., шаўцу 300 зл., узгадавацелькам Беларускага Прытулку, якім апекавалася Беларускае Дабрадзейнае Т-ва з волатам Аршуном на чале Пісаравічанкі і Пратасэвічанкі 96 зл., кухаркі і прачкі разам 90 зл. дый за спажывецкія прадукты, якія панабіралі ў крамі на суму 100 зл. Усяго агулам на 1,316 зл. Досыць цікава, скуль знойдзе грошы гэтае фікцыйнае Т-ва, гэтыя Паўлюкевічаўскія і Валэйшаўскія кветкі, каб здаволіць сваіх даўжнікоў. А можа пан „доктар" дасьць авансік і гэтым самым выручыць сваіх „верных" камрадаў з прыкрага палажэньня?!.

✕ **Як жывецца афэрыстам.** 4 траўня с. г. Горадзенскі Акружны суд разглядаў справу быўш. кіраўніка фундуша безрабоцьця Зялкоўскага Станіслава, які пад час кіраваньня гэтым фундушам растраціў 8,000 зл. казённых грошай, што меліся пайсьці для помачы безработным. Гэты факт быў сцьверджаны на судзе. Але не дарма-ж растратчык—„вялікі патрыёт", бо пад часе свайго пабыту ў вастрозе выкрыў якуюсь „уцечку вязьняў" (самім-жа зарганізаваную). Дастаў ён толькі 6 месяцаў вастрогу, і то не пасадзілі, а звольнілі пад залог да апэляцыйнага суда.

Молат.

Карэспандэнцыі.

Культурна-асьветная праца на вёсцы.

(Баранавіцкі пав.).

Ня гледзячы на ўсялякія перашкоды, праца культурна-асьветная на вёсцы йдзе наперад шпаркім тэмпам; яна з кожным днём паглыбляецца і што-раз пашырае свой кругазор, ахопліваючы ўсякія мажлівыя кірункі ды павялічваючы лік працаўнікоў. Асабліва гэтая праца прыносіць добрыя рэзультаты там, дзе хапае правадыроў-інтэлігенцыі, але інтэлігенцыі актыўнае, энэргічнае, якая не баіцца, як тая мыш гаспадарскае мятлы, меншых, ці большых перашкод, не апускае рук і не адступае абы перад чым назад, а ўпарта і заядла пнецца да мэты. Нажаль, такое праўдзівае інтэлігенцыі ў нас зусім мала, найбольш-жа спатыкаецца скурнікаў, эгаістаў дый горш яшчэ здраднікаў. Для доваду вышэйсказанага можа паслужыць вёска Жарабковічы, Ляхавіцкае гм. Есьць тут многа адукаваных хлапцоў, быўшых расейскіх урадоўцаў і др., надта энэргічных, дык ёсьць каму працаваць. Праўда, нядаўна яшчэ тут была пагалоўная несьвядомасьць; хлопцы і асабліва старэйшыя ня ведалі, хто яны такія. Але, калі пасьля вайны хваля сьвядомасьці дакацілася і сюды, калі сюды трапіла беларуская газэта, дык Жарабковічы хутка прабудзіліся ад сну. Яны дружна ўзяліся за работу. Ня гледзячы на кароткі час, вынікі добрыя, рэзультаты відавочныя, арганізавалі ганёвую стражу, маюць сякія-такія прылады і на выпадак няшчасьця могуць прынясьці вялікую карысь і сабе і суседнім вёскам. У мінулым годзе быў заложаны Гурток Беларускай Сялян.-Раб. Грамады, які зьяўляўся адзіным на ўсю гміну і цэлую ваколіцу, а пазьней гурток Т-ва Беларуск. Школы. Адчынена бібліатэка. Калі гэты год прынёс з сабой рэпрэсіі: арышты паслоў і ліквідацыю Грамады, дык здавалася, што і ў Жарабковічах спыніцца праца. Аднак не. І цяпер тут кіпіць, як у гаршку, або бурліць, як вясеньняя вада, каторая асвабадзілася з ледзяных акоў; але цяпер ідзе толькі культур-

на-асьветная праца. Адбываюцца паседжаньні гуртка Т-ва Бел. Школы, узбагачваецца бібліатэка, ладзяцца спэктаклі. Заданьнем найбліжэйшай прышласьці ёсьць з'арганізаваньне добрага хору ды ператтварэньне магазыну на збожжа ў народны дом.

Падобныя культурна-асьветныя пачынаньні—гэта залог лепшае будучыні, сьвятлейшага заўтра, якія сьведчаць, што раней ці пазьней узыйдзе яснае сонца, што дасьць нам сьвятло і разгоніць цемру і паняверку, бо, як кажа нам пясьняр, „жыве і жыць будзе ня зьнішчана сіла". Ніякія напасьці, перашкоды ня змогуць сьпыніць хвалі народнага прабуджэньня. **Той самы.**

І ў нас пачалі кратацца.

(Нясьвіжскі павет).

У вёсцы Новасёлкі, Гавезьненскай воласьці, у магазыне на праваслаўны Вялікдзень адбылася вечарына, ладжаная моладзю засьценку Стрыхароўшчына. Пастаўлена была традыкамэдыя „Выбары старшыні". Вельмі добра гулялі: Скрабука—Мікалай Нячай, Тадору—Антаніна Цурыла, Міцкуна—Татур. Нагул, ня гледзячы на тое, што некатарыя з нашых артыстаў былі першы раз на сцэне—гулялі вельмі добра. Моладзь паеходзілася з суседніх вёсак, так што магазын быў бітком набіты. Усе прысутныя на спэктаклі былі вельмі задаволены. Адно вучыцель і вучыцелька з нашай вёскі, ня гледзячы на адумысловыя запросіны, на спэктакль не зьявіліся. Мусіць, панам галілеям не па шэрсьці беларуская культура. Пажадана, каб такія вечарынкі ставіліся нашай вясковай моладзю часьцей, можа-б тады мы пазналі сябе лепш, цанілі-бы ўсё сваё і не казалі-бы, што ня ведаем, хто мы такія, або, што мы палякі ці расейцы, а называліся-б тым, кім мы ёсьць—беларусамі. І замест таго, каб сьмяяцца з усяго свайго роднага — узялі-бы прыклад з Стрыхараўцаў і самі ўзяліся-бы за культурную працу.

Хай жыве беларуская культура і хай жывуць людзі, што ўзмацняюць, абагачаюць і пашыраюць яе. **Прысутны.**

З Вяліка-Кракоцкага Гуртка Т-ва Белар. Школы.

(Слонімскага пав.).

Вяліка-Кракоцкі Гурток Т-ва Беларускае Школы шчыра дзякуе грамадзянам, злажыўшым ахвяры на Вяліка-Кракоцкую бібліатэку імені Янкі Купалы.

У вёсцы вялікая-Кракотка, Міжавіцкае воласьці, Слонімскага пав., сябрамі Гуртка Т-ва Белар. Школы 26/IV. 1927 г. быў пастаўлены спэктакль. Адыгралі п'есы: „Выбары старшыні" і „Зьбянтэжаны Саўка". Ня гледзячы на тое, што ўсе артысты выступалі на сцэне першы раз, спэктакль удаўся наславу, і навет ня сорамна было-б яго паўтарыць і ў месьце. Ня буду нічога гаварыць аб жарціку „Зьбянтэжаны Саўка", які ня толькі разьвесяліць, але навет рассьмяшыць найсумнейшага, але і „Выбары старшыні" згулялі, як ня трэба ляпей. Асабліва добра ўдаўся 3-ці акт, у якім публіка, як-бы забылася, што сядзіць у ўбогай вясковай будыніне, так усе ў ім старанна было прыбрана, як быццам на запраўдным вясельлі. Хто з артыстаў гуляў ляпей, а хто гарэй, сказаць трудна, бо ўсе яны былі на сваім мейсцы. Прысутных было да 200 асобаў і ўсе яны, калі судзіць па іх здароваму сьмеху, і не змаўкаючым воплескам, былі надта задаволены з вечарыны. На вялікі жаль памешканьне не магло зьмясьціць усіх жадаючых напасьць на вечарыну і шмат каму прышлося вяртацца дамоў. Мілае ўражаньне рабіў і ўбогенькі струнны аркестр. Усе так былі зацікаўлены, што і не агледзіліся, як праляцелі гадз. тры. Даход ад прадажы білетаў выносіць 75 злотых, якія з папаўненьнем расходаў на пастаноўку і будаваньне сцэны, пойдуць на папаўненьне бібліатэкі-чытальні імені нашага слаўнага песьняра Янкі Купалы.

Прывет вам, маладыя барацьбіты, на шляху барацьбы з цемраю, а вам дарагія госьці, сэрдэчная падзяка. **Прысутны.**

„Понимаете, контр-атака"!

(З Баранавіч).

—Вы понимаете?!... А Барановичи я все-же штурмом возьму! — сказаў Паўлюкевіч пасьля ўсіх сваіх няўдачных гастроляў у Баранавічах.

А якжа ж, толькі-што было заснаваў тут „Прасьвету", купіўшы дарага некалькі хлапцоў, раптам гэтыя-ж сябры „барыкадзіруюцца" у „Прасьвеце" і аглашаюць публічны байкот Паўлюкевіча ў Баранавічах. Тады ён „купляе" новых трох сяброў-надросткаў і ізноў закладае „Прасьвету", але ўжо на іншай вуліцы. А разам з тым думае і аб гэнэральным штурме, каторы плянуе на дзень 30 красавіка гэтага году у кампаніі з Сельсаюзьнікамі.

Канцэрт віленскіх артыстычных сіл і скокі пад вайсковую аркестру прыцягнуць бязумоўна тутэйшых беларусаў у салю, а тады я ім і выскажу ўсё што думаю,—а думаю я добра аб камунізуючых, — пахваляўся „доктар" Паўлюкевіч.

Аднак на беларусаў прыйшлося яму чакаць у азначаны дзень доўга, бо ад 8 да 11 гадзіны вечара і ўсё-ж ані адна асоба не націкавілася „забавай" п. Паўлюкевіча. Але за тое а гадзіне 11 ай у салю праз люфцікі вакон паляцелі каменьні, бутэлькі і іншыя няпрыемныя рэчы...

Понимаете, это контр-атака! — ускрыкнуў п. Паўлюкевіч і, падляцеўшы да паліцыянтаў, прасіў іхісьці да кватэр і зрабіць вобыскі ў сяброў „Прасьветы", у б. старшыні тэй жа Плаўсюка.

Аднак вобыск ня даў ніякіх рэзультатаў.

Далей неўгамонны „доктар" у дзень 1-га траўня завітаў у салі, дзе сабраліся на сьвяткаваньне работнікі места. Аднак і тут яго адразу пазналі, дык, папіхаючы штурханцамі, папрасілі яго вон з салі.

Вось дык... штурм! **Свойскі.**

Сэквэстратар у турме.

(вол. Веніца, Маладэчанскі пав.).

Як была карэспандэнцыя ў „Сял. Праўдзе" пра гэтага сэквэстратара Ст. Сэцэрку III р. П. В. у Маладэчне, як ён сьцягаваў падаткі і перабіраў грошы ў бедных сялян. І вось была зложана інтэрпэляцыя паслямі Бел. Сял.-Раб. Грамады праз Сойм і да мін. унутр. спраў. І вось, дня II./XII. 1927 г., было ў гэтай справе сьледства. У Асіповіча ў фальв. Манюшчыцах перабраў 33 зл. 30 гр. і яшчэ перадаў у суд за сапраціўленьне за мяпраўду і многа было другіх выпадкаў. Мусі быць добра нарабіў, што аж пасадзілі ў Вільню на Лукішкі гэтага сэквэстратара. А больш нічога, а што грошы перабраў у бедных сялян, то „наздароўе яму" — не вярнулі, а мусіць і ня вернуць.

Дык вось, браткі, няма каму цяпер нас бараніць, бо гэтыя паўлюкевічы, хадэкі ды сельсаюзьнікі толькі лаюцца, а бараніць сялянскія інтарэсы няма каму. **Алекса.**

Яшчэ аб папу Іс. Насекаелу.

(М-ка Маркава, гміны Лебедзеўскай, павету Маладэчанскага).

Ужо колькі разоў успамінаецца гэта імя папа ў беларускіх газэтах, мо' навет і няварта імя гэта такой „чэсьці"; але што маем зрабіць мы — бяссільныя сяляне? Падавалі просьбу Віленскаму Уладыку, але ні-ж „баліць каму цяжкая рана". У адказ не забіраюць гэтага „айца духоўнага". Вось колькі разоў было апісана пра адносіны Іс. Насекаела да сялян, але для праўды надаю яшчэ.

Дня 28/IV 27 году ўбегла парасё ўдавы Ант. Разуновічавай у яго гарод. Забраў ён у хлеў, (цікава, што цяпер ёсьць у гародзе? Сьляды сьнегу)! Дзяржаў два дні гэтае парасё, не даючы нічога есьці. Калі А. Р. прышла прасіць, каб аддаў, а за тое яна паможа жаць, ці што іншае, то поп на словы не паверыў і сказаў, каб у залог прынясла сякеру (бо ў яго нябыло чым рубаць дроў). А як браў сякеру, то ей тады сказаў, што калі зараўнуе равы, яшчэ ад часоў вайны, якія немагчыма зарыць нікаму, дык аддасьць сякеру. Ну, і што рабіць беднай удаве, а навет нам усім сялянам (бяда супольная) з гэтым „айцом духоўным". Няхай-жа пачуе наш голас Уладыка і паможа нам.

Палек Алекса.

З мухі зрабілі вала.

(Вёска Азёраўцы, Браслаўскага павету).

29 красавіка ў вёсцы Азёраўцы Браслаўскага павету, адбылася беларуская спэктакль-вечарына, ладжаная Гуртком Т-ва Беларускае Школы ў в. Азёры. Пасьля прадстаўленьня і скокаў, калі старэйшыя з нашай і з іншых вёсак паразыходзіліся на хатах, некатарыя з Азёраўскіх хлопцаў здумалі падвясьці аднаго з сваіх кумпанаў, што ішоў у Браслаў на службу. Каб было сьмяшней, адзін з хлапцоў, выцягнуўшы з плата палку, прывязаў да яе насатку і так з імправізаваным штандарам уся моладзь пашла праз вёску. Падвёўшы ўспомненага кумпана за вёску, хлопцы вярнуліся і разышліся па хатах. І ўсё б было добра, каб ня сышчык Канеўскі (бышы паліцыянт), які піў у хаце Пётры Грыблама з гаспадаром і з Баляславам Сарбінтовічам і бачыў, што рабілі хлопцы. Сышчык гэты доўга ня думаючы саставіў пратакол аб тым, што Азёраўская моладзь рабіла дэманстрацыю і пяяла нелегальныя песьні. Сьведкамі былі ўспомненыя сабутыльнікі Баляслаў Сарбінтовіч і Пётра Грыблам. З таго часу прайшоў цэлы тыдзень. Моладзь наша гатавалася якраз да другога спэктаклю — на першае мая. Аж-но ў гэты дзень прышла браслаўская паліцыя на чале з камандантам і пасьля вобыскаў арыштавала: грамадзяніна Кастуся, Вінцуся і Янку Маліноўскіх, Язэпа Вінцуся і Пётру Пяткуноў, Кастуся Сапоньку і Кастуся Максімовіча, абвінавачваючы першых сяброў у „проціпаньствовай маніфэстацыі", а апошняга (па даносу, на Станіслава Пяткуна) як рэгэнта хору ў тым, што ён навучаў пяяць нелегальныя песьні. Аднак праз суткі гэтага рэгэнта выпусьцілі, а астальных сямёх скавалі і паслалі на Лукішкі. І так не вядома, за што змушаны яны будуць сядзець аж да суда, які напэўна апраўдае нявінных сялян. Але, калі будзе той суд, не вядома, а хлопцы бедныя сядзі, бо да суда выпушчаюць толькі пад залог у 1000 зл. А дзе ж яны возьмуць такія грошы? Дык вось як робяць з мухі вала. **Абураны азёравец.**

Беларускі Каапэратыўны Банк.

(Паводле справаздачы на агульным сходзе).

Як мы ўжо паказвалі, 29 красавіка адбыўся ў Вільні гадавы агульны сход сяброў Беларускага Каапэратыўнага Банку. Мы ўжо падалі галоўныя пастановы сходу; цяпер-жа хочам пазнаёміць нашых чытачоў з дзеяльнасьцяй адзінае беларускае крэдытнае ўстановы на ўсю тэрыторыю Заходняе Беларусі.

На 1-га студзеня 1926 году лічылася ўсяго толькі 38 сяброў Банку. Але ў працягу 1926 году лічба сяброў шыбка расьце, і на 1 га студзеня 1927 году Банк мае ўжо **963 сяброў.**

Характэрна, з каго складаюцца гэтыя сябры. Сярод іх—**874 сялян**, 7 гандлёвых і прамысловых прадпрыемстваў, 7 дворных і прамысловых работнікаў, 64 працаўнікі дзяржаўных і грамадзкіх установаў, ды 11 — іншых. Гэтак ясна, што Банк зьяўляецца перадусім **сялянскай установай** і **абслугуе інтарэсы сялянства.**

Найвышэйшы крэдыт паасобным сябром у мінулым справаздаўчым годзе вызначаўся 800 злот., а працэнтная такса, згодна з урадавымі распараджэньнямі аб паніжэньні яе, з 24 гадавых памяншалася сьпярша да 18%, а пасьля да 16%.

Усяго за год было выдана сябром Банку праз Цэнтралю і два аддзелы — Пінскі і Глыбоцкі — пазык на агульную суму **28,423 злот. 62 гр.** і **20,636 амэрык. даляраў**, з якіх аставалася няплачаных на 1 га студзеня 1927 году 22,293 зл. 57 гр., ды 6,560 амэр. даляраў. Апрача таго, пад залог рэчаў выданы 44 пазыкі на суму 1,165 даляраў, з якіх на 1-га студзеня с. г. аставалася няоплочаных 10 пазык на суму 264 дал.

Запратэставаных вэксалёў (неаплачаных у пару) было на суму 2,016 даляраў. Частка была выкуплена пасьля пратэсту, а ў партфэлі Банку асталося на 1,128 даляраў. Грошы па іх спаганяюцца праз судовых каморнікаў.

Паложана ў Банк грошы, як **тэрміновыя ўклады**, 4,583 даляры. На 1-га студзеня 1927 году—разам з узносамі папярэдняга году—на гэтым рахунку аставалася 4,931 дал.

На **бягучы рахунак** было паложана ў працягу 1926 году 72 541 злотых і 8,895 даляраў. На 1-га студзеня с. г. на гэтым рахунку аставалася 16,702 злот. 72 гр. і 3,773 даляры.

Па тэрміновых укладах Банк налічаў і выплачаваў 12% гадавых, а па бягучых рахунках—3%. Усяго за мінулы год было налічана і выплачана працэнтных грошы па тэрміновых укладах і бягучых рахунках 3,879 зл. 50 гр., атрымана зваротна і залічана на рахунак 49 зл. 56 гр., а сума нэтто гэтых працэнтаў сьпісана на рахунак прыбыткаў і страт.

Банк знаходзіцца ў карэспандэнцыях зносінах з Каапэратыўным Транзітным Банкам у Рызе, па загаду якога выканаў **грашовых пераказаў з заграніцы ў Польшчу на суму 10,989 даляраў.**

Банк за выдадзеныя пазыкі ў працягу 1926 году атрымаў працэнтаў 19,069 злот. 82 гр., зьвернена 271 зл. 91 гр. З сумы нэтто атрыманых %% (18,797 зл. 91 гр.) адлічана на рахунак узятых за 1927 году працэнтаў 1,186 злот. 48 гр., а рэшта ў ліку 17,883 зл. 34 гр. пералічана, як прыбытак брутто, на рахунак прыбыткаў і страт.

Па рахунку **бюджэтных выдаткаў** (расходы на ўтрыманьне і апэрацыі Банку, ды інш.) было выдана за год 15,634 зл. 13 гр., зьвернена 1,410 зл. 98 гр., а рэшта сьпісана на рахунак прыбыткаў і страт.

Чысты прыбытак Банку за мінулы год выразіўся **ў суме 1,054 зл. 31 гр.** Згодна з прапазыцыяй Управы Банку, агульны сход пастанавіў ужыць гэтыя грошы гэтак: адлічыць **у запасны капітал**, згодна з § 40 статуту, 105 злот. 43 гр., а рэшту—**948 зл. 88 гр.**—залічыць, як **дывідэнд (да падзелу)** на паявы капітал.

Пераглядаючы ўсе гэтыя сухія цыфры і факты, мы бачым, якую вялікую работу зрабіў Беларускі Каапэратыўны Банк у працягу аднаго толькі году свайго істнаваньня, бо ў папярэднім годзе—1925—Банк распачаў сваю працу толькі ў лістападзе месяцы. Каля тысячы асоб, у вялізарнай большасьці сяляне-земляробы, запісаўшыся сябрамі Банку, з сваіх уласных складак ды з абаротных сум, пакладзеных прыватнымі асобамі і ўстановамі на працэнты, здалелі самі сабе адкрыць крэдыт на паважную ўжо суму, якая, пераводзячы даляры на польскую валюту, дасягае **212 з нечым тысячаў.** Ужо з гэтага відаць, што гэткая ўстанова, як Бел. Каап. Банк, мае добры грунт у масах дзеля свайго разьвіцьця і зьяўляецца вельмі цэнным спосабам дзеля **сялянскае самапомачы** ў галіне крэдытаваньня на гаспадарчыя патрэбы. І можам зусім шчыра далучыцца да выказанага агульным сходам пажаданьня, каб уся Заходняя Беларусь хутчэй пакрылася правінцыянальнымі аддзеламі Банку, даючы магчымасьць нашаму сялянству і зьберагчы свой уласны грош, калі такі прыпадкам завядзецца, і мець у патрэбе пэўную і невялікім коштам дапамогу.

Хай-жа і Управа Банку, і нашы грамадзія дзеячы па паветах і вялікшых мястэчках паруппяцца аб тое, каб закласьці ў сябе аддзелы Банку, і гэта шмат узмацуе і Банк, і фінансавыя магчымасьці нашага сялянства.

Каапэратар.

Гадавая абаротная ведамасьць
Беларускага Коопэратыўнага Банку у Вільні за 1926 год.

НАЗОУ РАХУНКУ	САЛЬДО на 1/I 1926 г.				ДЭБЭТ				КРЭДЫТ				САЛЬДО на 1/I 1927 г.			
	злот.		дал.		злот.		дал.		злот.		дал.		злот.		дал.	
АКТЫУ																
Рахунак:																
Касы	887	38	178	—	121533	32	28008	—	118704	74	26817	—	3715	96	1369	—
пазык	1250	—	1040	—	28423	62	20636	—	7380	05	15116	—	22293	57	6560	—
бюджэтн. выдаткаў	—	—	—	—	15634	13	50	—	15634	13	50	—	—	—	—	—
розных выдаткаў	486	40	—	—	15994	53	100	—	4573	12	100	—	11907	81	—	—
Банку Бунімовіча	—	—	—	—	—	—	10	—	—	—	10	—	—	—	—	—
карэспандэнтаў	—	—	—	—	42126	12	7635	29	42126	12	7148	—	—	—	487	29
учота вэксалёў	—	—	—	—	840	44	40	—	840	44	—	—	—	—	40	—
Банку з аддзеламі	—	—	—	—	5521	28	4465	—	5521	28	4465	—	—	—	—	—
Пазык пад заставу	—	—	—	—	—	—	1165	—	—	—	901	—	—	—	264	—
Пратэстав. вэксалёў	—	—	—	—	—	—	2016	—	—	—	888	—	—	—	1128	—
Аддзелаў з Банкам	—	—	—	—	34047	58	11757	—	33337	39	11562	—	710	19	195	—
% выдан. па ўзнос.	—	—	—	—	3879	50	—	—	3879	50	—	—	—	—	—	—
рухомай маемасьці	—	—	—	—	775	15	—	—	77	51	—	—	697	64	—	—
Балянс	2623	78	1218	—	—	—	—	—	—	—	—	—	39325	17	10043	29
ПАСЫУ																
Рахунак:																
паявога капіталу	950	—	—	—	25	—	—	—	17090	45	—	—	18015	45	—	—
запасовага капіталу	10	—	—	—	—	—	—	—	105	43	—	—	115	43	—	—
узносаў тэрмінов.	—	—	1111	—	—	—	763	—	—	—	4583	—	—	—	4931	—
бягучых рахункаў	1427	51	—	—	57265	84	5122	—	72541	05	8895	-	16702	72	3773	—
пераказаў	—	—	—	—	—	—	10989	29	—	—	10989	29	—	—	—	—
пераходных сум	90	83	60	80	5097	95	1349	80	7754	15	2628	29	2747	03	1339	29
карэспандэнтаў	—	—	46	20	—	—	46	20	—	—	—	—	—	—	—	—
% прыч. па ўзносам	145	44	—	—	89	52	—	—	1688	62	—	—	1744	54	—	—
% па опэрацыям	—	—	—	—	19069	82	70	—	19069	82	70	—	—	—	—	—
Аддзелаў з Банкам	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Банку з аддзеламі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
Прыбылі і страты	—	—	—	—	19428	59	—	—	19428	59	—	—	—	—	—	—
Балянс	2623	78	1218	—	369752	39	94222	58	369752	39	94222	58	39325	17	10043	29

УСЯЧЫНА.

Дрэва, што пажырае людзей.

Тры гады таму назад у прэсе цэлага сьвету была зьмешчана вядомасьць аб выкрыцьці нямецкімі, ангельскімі і амэрыканскімі батанікамі дрэва на паўвостраве Мадагаскары, якое можа пажыраць вялікіх зьвяроў, а нават і людзей.

Гэта неправдападобная і фантастычная вядомасьць была пацьверджана вядомым гэографам др-ам Осборнэ'ам, які ў сваім часе абехаў цэлы Мадагаскар і спаткаў сярод тамтэйшых плямёнаў легэнду аб тым, што ў мадагаскарскіх лясох ёсьць дрэвы, якія аджыўляюцца людзкім мясам.

Істанаваньне такога дрэва зноў-жа была пацьверджана лістом праф. Сехэ. У лісьце гэтым, адрэсаваным др-у Фрэдлоўскаму, вучоны цьвердзіць, што бачыў гэтае дрэва сваімі вачыма. Быў нават сьвядкам оргіі, у часе якой тамтэйшыя людзі склалі ахвяру людзкую гэтаму страшнаму дрэву. Дрэва прафэсар Сехэ апісываа так: Пень экзотычнай расьліны мае быць падобны да вялічэзнай сосны. Ад верхавіны спускаюцца ўніз ад 4 да 5 вялікіх лістоў даўжынёй ад 4 да 5 мэтраў. Шырыня гэтых фантастычных лістоў даходзіць да 80 цэнтымэтраў. Яны шаршавыя і цьвярдыя, як валовая скура. Кожны ліст мае 30 цэнтымэтраў і пакрыты вялікімі калючкамі, як цьвякамі. На верхавіне дрэва знаходзяцца келіхі, з якіх заўсёды капае моцна пахучая жыжка. Сехэ апісывае так-сама як гэтае страшнае дрэва пажырае чалавека. Краёўцы змусілі адну кабету ўзлесьці на дрэва і піць здурэючую жыжку. Яе толькі няшчасная кабета дакнулася да аднаго з келіхаў, чатыры лісты падняліся ўверх і шчыльна замкнулі кругом ахвяру. І так былі замкнутымы ў працягу двох тыдняў. Калі Сехэ праз нейкісь час праходзіў каля дрэва, пабачыў толькі белы чэрап ад галавы —астаткі страшнога банкету. Нядаўна была ў Афрыцы ангельска-амэрыканская экспэдыцыя пад кіраўніцтвам падпулкоўніка Yонга, якая пацьвярдзіла істнаваньне такога дрэва. Вялічэзная расьліна аджыўляецца пераважна мясам зьвяроў і зьяўляецца нязнанай да гэтага часу адменай расьліны, пажыраючай кузулек.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.